**Булацкая Н.А.,**
*дацэнт*

## ЛІТАРАТУРА Ў СІСТЭМЕ РАЗВІЦЦЯ АГУЛЬНЫХ І СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ: ПРАБЛЕМЫ, РАШЭННІ

Духоўнае абнаўленне грамадства, аб якім апошні час многа гавораць, адбываецца тады, калі абнаўляюцца чалавечыя душы, калі людзі пазбаўляюцца хлусні, рабскай пакорлівасці, спажывецкіх адносін да жыцця, жорсткасці да іншых. Ролю літаратуры ў гэтым нельга перабольшыць. Тым больш, што наша ВНУ — творчая, нашы студэнты — асобы творчага складу, наш клопат скіраваны на развіццё іх здольнасцей.

Вядома, што агульныя здольнасці: уважлівасць, працаздольнасць, памяць, кемлівасць, настойлівасць у пераадоленні цяжкасцей і інш.— садзейнічаюць добраму авалодванню ведамі. Спецыяльныя здольнасці праяўляюцца ў асобных відах дзейнасці і знаходзяцца ва ўзаемасувязі з агульнымі, развіваюцца ў адзінстве, таму пры выкладанні літаратуры неабходна шукаць новыя метады і прыёмы, не прытрымліваца толькі аднаго з найбольш распаўсюджаных спосабаў падрыхтоўкі спецыяліста ў галіне культуры — мэтанакіраванага падбору матэрыялаў, твораў, тэкстаў, абзацаў і старонак, якія маглі б паслужыць прафесійнаму інтарэсу будучых работнікаў культуры. Канешне, будучаму харэографу можа спатрэбіцца бліскучае апісанне балю, касцюмаў, танцавальных «па» ў «Вайне і міры», «Анне Карэнінай» Л.Талстога. Для сацыяльных педагогаў-эколагаў цікава прааналізаваць сумнае чэхаўскае апавяданне «Жалейка». Тым, хто марыць прысвяціць свой лес мастацтву, карысна было б пачуць пушкінскую «Пікавую даму» пад музыку П.Чайкоўскага, звярнуць увагу на героя «Паэта» К.Чапека ці прасачыць за працэсам абуджэння творчай асобы ў рамане «Марцін Ідэн» Д.Лондана. І абавязкова для ўсіх -- верш у прозе С.Сцепняка-Краўчынскага «Чарадзею», які закранае праблемы творчага акта, прызвання і перасцярогі на шляху поспеху і славы.

Прыкладаў, што даюць магчымасць удасканаліць прафесійнае майстэрства, чытаючы літаратуру, вельмі многа. Аднак што з таго, калі чытаць толькі з прафесійнай цікавасцю?

Гаворачы аб падрыхтоўцы спецыяліста, асабліва ў галіне культуры, перш за ўсе трэба мець на ўвазе выхаванне чалавека, яго гонару і высакародства, годнасці і мужнасці, у цэлым маралі. Гэта неабходна, бо ў адваротным выпадку, не дай Бог, атрымаецца тое, аб чым, чытаючы Біблію, папярэджваў І.Бунін у сваіх «Акаянных днях» /1918г./:«Честь унизится, а низость возвысится. В дома разврата превратятся общественные зрелища... И лицо поколения будет собачье!». Ісці трэба ад агульнага да прыватнага. Ад развіцця асобы — да фарміравання прафесіянала.

Здольнасці развіваюцца ў працэсе навучання. Калі мець на ўвазе апошняе, неабходна стымуляваць вучэбна-пазнавальную актыўнасць, развіваць мысленне. Мы часта наракаем на нашу моладзь, маўляў, гультаяватая, нішто яе не цікавіць. Гаворым пра гэта ўслых, як бы жадаючы падштурхнуць, разбудзіць самалюбства маладых людзей. Студэнты ж, мяркуючы па размовах з імі, гатовы да ўспрымання новых тэндэнцый у літаратуры, навукі, грамадскім жыцці. Але часам ім не хапае ведаў, цярпімасці да іншых канцэпцый. Яны чакаюць выкладання не толькі ў форме, якая б зацікавіла іх /не лічым гэта грэхам/. Размова не пра тое, каб падкінуць сенсацыйную дэталь, станоўчыя сцвярджэнні, плюсы змяніць на мінусы. Яны хочуць пачуць выказванні пра вечныя пытанні жыцця і смерці, Бога, каханне. Якую выбраць форму, як зрабіць цікавай і зразумелай лекцыю, семінар, — адна з асноўных праблем выкладання літаратуры. Часцей жа за ўсе формамі развіцця здольнасцей асобы выступаюць дыскусіі, публічнае абмеркаванне праблем, семінарскія заняткі. Што новага можа прапанаваць выкладчык? Якой павінна стаць яго дзейнасць?

Вядомы тры асноўныя віды дзейнасці: гравая, вучэбная,працоўная. Літаратура дае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасць звязаць іх разам, тым больш, што ў творчай ВНУ студэнт — асоба эмацыянальна разняволеная, нацэленая на поспех. Поспех жа акрыляе, параджае парыў, узнёсласць, якія неабходны ў творчасці. Важная роля ў гэтым адводзіцца выкладчыку, які становіцца вучоным і настаўнікам адначасова. Ён мусіць быць не толькі адукаваным, але і апантаным у сваёй працы, добра ведаць жыццё, разумець праблемы сучаснасці, разбірацца ў розных відах мастацтва, валодаць сучаснымі методыкамі, умець мадэліраваць сітуацыі.

Працэс развіцця здольнасцей студэнта абавязкова павінен прадугледжваць фарміраванне светапогляду і маральна-эстэтычнай культуры маладога чалавека. Вельмі важнай у гэтым з'яўляецца роля літаратуры. Пільная ўвага літаратуры да асобы, да яе светапогляду і псіхалагічных асноў прадстаўлена ў адзінстве маральных і эстэтычных праблем. Варта падкрэсліць не столькі значэнне маральных перадумоў для творчасці, колькі здольнасць праз эстэтычнае ўспрыманне раскрыць маральны патэнцыял асобы. Звярніце ўвагу на Наташу і Пецю Растовых у «Вайне і міры» Талстога. Падкрэслены ў іх аўтарам музычны пачатак — важная прыкмета дабрыні, чуласці. Душэўная сухасць, неразвітасць пачуцця ў Курагіных і Берга, напрыклад, арганічна спалучаюцца з маральнай пустатой, няздольнасцямі агульначалавечымі, калі можна так сказаць.

У любога чалавека пры чытанні ўзнікаюць свае ацэнкі прачытанага. І немалаважна, як будуць успрыняты ідэі, героі, як аднясецца да іх чытач, ці зразумее ён аўтара, што гэта дасць яго асобе. Пры ацэнцы твора мастацтва чалавек аказваецца ўнутрана звязаным і з ацэнкай зусім не мастацкай з'явы, а ўчынкаў, спосабу жыцця, характару людзей, якія знаходзяцца побач.

Не можа быць павышэння ўзроўню ведаў і творчага развіцця асобы без рэзкага павышэння ўзроўню агульнакультурнага развіцця як студэнта, так і выкладчыка. А гэта значыць, неабходна фарміраваць маральна-валявыя, інтэлектуальна-эстэтычныя, культурна-творчыя здольнасці асобы. Трэба пераадолець вузкадысцыплінарнае мысленне і вызначыць асобную мэту — навучыць студэнта ўменню вырашаць шырокі спектр задач, садзейнічаць развіццю навыкаў і ўменняў: умення ўбачыць і вызначыць праблему, абгрунтаваць падыходы да яе вырашэння, ажыццяўляць самакантроль і інш. Цікавыя адказы ў працэсе анкетавання, праведзенага ў ВНУ культуры Расіі, далі студэнты. На пытанне аб тым, што ім неабходна ўмець, каб спраўляцца з будучай работай, большасць (67%) адказалі: «Умець наладжваць адносіны з людзьмі». У гэтым плане 69% назвалі, паставіўшы на першае месца сярод агульных дысцыплін, педагогіку і псіхалогію, 59% — літаратуру і мастацтва, 18% — эканамічныя веды, 11% — кіраўніцкія дысцыпліны. Толькі 2% апытаных палічылі неабходным уменне напісаць навуковы артыкул, 5% -арганізаваць канферэнцыю, семінар, сустрэчу. Зыходзячы з вынікаў анкетавання, у нашым універсітэце можна скарэкціраваць работу кафедраў, і любімыя многімі выкладчыкамі рэфераты, напрыклад, замяніць іншымі відамі і формамі работы. Паспрабуйце замяніць напісанне рэферата студэнтамі ФБІС работай па набыццю навыкаў, уменняў скласці анонс, рэкламу твора, кнігі альбо часопіса. Будучаму бібліятэкару гэта спатрэбіцца.

Дзеля таго, каб выхаваць творчую асобу, даць ёй практычныя навыкі і ўменні, павінен быць час, дастатковы для такой работы. На жаль, на факультэтах мастацкай творчасці, культуралогіі Беларускага універсітэта культуры колькасць гадзін на вывучэнне літаратуры, тэрміны вывучэння дысцыпліны неверагодна малыя, а літаратурная адукацыя спыняецца на першым або другім курсе. Назвы, імёны, плыні ў літаратуры... А ці можна такім чынам развіваць творчае мысленне, творчыя здольнасці? Чыста разумовае ўспрыняцце літаратуры вельмі часта перашкаджае разуменню яе сапраўднага сэнсу.

Навучыцца разумець слова — навучыцца думаць. Той, хто не пачуў слова, напрыклад Дастаеўскага, не пачуе, як б'ецца сэрцы яго герояў-мучанікаў /дарэчы, у асноўным маладых людзей/, і сам не будзе задумвацца над бязлітаснымі пытаннямі, якія задае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пісьменнік. І толькі недастаткова адукаваны студэнт, будучы рэжысёр, кінецца ставіць нешта з «Д'яблаў» Ф.Дастаеўскага, таму што гэты твор раптоўна стаў модным.

Неабходна ўздзейнічаць на фантазію студэнта-чытача, залучыць яго ў своеасаблівую гульню: прымусіць жыва, пластычна ўсё ўяўляць. Тым больш карысна гэта для творчай асобы.

Возьмем у якасці прыклада таго ж Л.Талстога. У мастацкім свеце, у якім жывуць выдуманыя персанажы «Анны Карэнінай», усё важна: і вушы Карэніна, якія «тырчаць», і завіток валасоў на шыі Анны, і моль, за палётам якой сочаць раўнадушныя вочы адваката падчас візіту яго да расстроенага Карэніна. Дробязі, як здаецца спачатку. Але ж з іх ствараецца ва ўяўленні чытача карціна жыцця, ён дамалёўвае недастатковыя рысы, спачувае героям, г.зн. пісьменнік абуджае пачуцці, думкі, уздзейнічае не толькі на здольнасць думаць, але прымушае і эстэтычна ўспрымаць мастацкі свет. Гульня ўяўлення абуджае актыўнасць фантазіі, дае штуршок творчай асобе, нараджае пошук, імкненне мастака, рэжысёра, акцёра перакласці гэта на мову іншых відаў мастацтва. Нездарма многія нашы студэнты стварылі і ствараюць ілюстрацыі да твораў сусветнай літаратуры, увасабляюць літаратурныя вобразы ў танцах, спевах, музыцы.

Сумеснае абмеркаванне, напісанне разам з выкладчыкам рэцэнзіі, артыкула — таксама форма развіцця спецыяльных здольнасцей, асабліва па спецыяльнасці «літаратурная работа».

Некаторыя дапытлівыя студэнты скардзяцца на недастатковы, з іх пункту гледжання, кантакт з выкладчыкам, у чым яны бачаць недахоп, бо толькі праз значны прамежак часу могуць атрымаць адказы на свае пісьмовыя работы альбо адзнаку і зрабіць неабходныя карэктывы, што садзейнічае больш глыбокаму разуменню праблемы, матэрыялу.

Яшчэ адной праблемай, вырашыць якую і неабходна, і можна, з'яўляецца веданне рэальных узроўняў агульнай і прафесійнай падрыхтоўкі студэнта на розных этапах навучання. Сувязі паміж кафедрамі — вось што патрабуе ўзмацнення. Напрыклад, кафедра педагогікі і псіхалогіі праводзіць тэстыраванне агульных, псіхічных якасцей асобы; кафедра сацыялогіі і культуразнаўства — анкетаванне, назіранне, інтэрв'юіраванне, экспертызу альбо іншыя метады сацыялагічнага даследавання; кафедра фізвыхавання вызначае фізіялагічны стан студэнта; прафілюючыя кафедры ацэньваюць спецыяльныя здольнасці і г.д. Атрыманая інфармацыя павінна быць даведзена да ўвагі кожнай кафедры, якая ўдзельнічае ў падрыхтоўцы пэўнага спецыяліста.

Адыходзіць у мінулае той час, калі бяспраўе кафедраў, выкладчыкаў, студэнтаў уніфіцыравала стыль навучання, якому былі ўласцівы аўтарытарнасць, перагружанасць праграм непатрэбнай інфармацыяй, адсутнасць самастойнай працы і творчасці. Але ж тварыць можа толькі той, хто здольны змяняць састарэлыя стандарты.

Кафедра як структурная адзінка ВНУ павінна мець не толькі абавязкі, але і правы. Трэба даць агульнаадукацыйнай кафедры свабоду і адначасова патрабаваць ад яе адказнасці. Адзінападабенства, абязлічанасць у падрыхтоўцы творчай асобы можа быць пераадолена з дапамогай увядзення па прапанове кафедры новых курсаў, спецкурсаў для той ці іншай спецыяльнасці, факультатываў, прадметаў па выбару, спецсемінараў /як найбольш універсітэцкай формы навучання/, запрашэння лепшых педагогаў, увядзення кантрактнай сістэмы пры падборы кадраў. Неабходна, напрыклад, у гэтым годзе падрыхтаваць дырыжора — план кафедры літаратуры такі, менеджэра — іншы. Кафедра павінна вырашаць, што будзе найбольш карысна /зразумела, у галіне літаратурнай адукацыі/ для будучага спецыяліста. Усё павінна абапірацца на маральнасць, прафесіяналізм і правы. У дадзеным выпадку кафедра літаратуры будзе разам са спецыяльнымі кафедрамі вырашаць праблему адукацыі творчай асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ